# «Душа народа ў творах іх жыве»





## Янка Купала і Якуб Колас

Віртуальная бібліятэчная выстава

У кожнага народа ёсць песняры, прарокі, што сілай свайго паэтычнага таленту вызначаюць не толькі шляхі развіцця роднай мовы, літаратуры, культуры, але і фарміруюць нацыянальную самасвядомасць, увасабляюць нацыянальную ідэю, даючы мэту і сэнс існавання не аднаму пакаленню. Яны становяцца сімваламі свайго народа. Для беларусаў такімі сімваламі з'яўляюцца Янка Купала і Якуб Колас.

*Звяртаем вашу ўвагу на віртуальную выставу, якая дапаможа вам у выбары лепшых твораў класікаў беларускай літаратуры Я. Купалы і Я. Коласа напісаных для дзяцей.*



**Янка Купала**
(Іван Дамінікавіч Луцэвіч)
1882-1942

**Магутнае слова, ты, роднае слова!**
**Са мной ты на яве і ў сне;**
**Душу мне затрэсла пагудкаю новай,**
**Ты песень наўчыла мяне.**
**Бяссмертнае слова, ты, роднае слова!**
**Ты крыўды, няпраўды змагло;**
**Хоць гналі цябе, накладалі аковы,**
**Дый дарма: жывеш, як жыло!**

Купала, Я. Хлопчык і лётчык : вершы / Я. Купала. - Мінск : Юнацтва, 1990. - 16 с. - ( Мая першая кніжка).




У сваім вершы «Хлопчык і лётчык», Я. Купала намаляваў воблік шчаслівага дзіцяці і яго імкненне паляцець высока ў неба.

Купала, Я. Сыны : вершы / Я. Купала. - Мінск. : Юнацтва, 1987. – 16 с. - ( Працу кожную шануй).




У вершы «Сыны» аўтар услаўляе шэсць сыноў старога бальшавіка, якія выбралі прафесіі хлебароба, рабочага-ліцейшчыка, бясстрашнага марака, смелага лётчыка, чырвонага байца-пагранічніка і паэта.

Купала, Я. Алеся : вершы / Я. Купала. - Мінск : Юнацтва, 1993. – 32 с. - ( Бібліятэка дзіцячага сада).




У гэту кнігу ўвайшлі вершы для дзяцей «Алеся», «Хлопчык і лётчык», «Сыны», «Юрачка», «Сосны», «Рэчка» і інш.

Купала, Я. Мой край : вершы / Я. Купала. - Мінск : Юнацтва, 1991. – 63 с. - ( Залаты ключык).




У гэту кнігу ўвайшлі 37 вершаў напісаных для дзяцей, якія паэт прысвяціў прыгажосці роднай прыроды, роднаму краю.

**Купала, Я. Зімой у лесе: вершы / Я. Купала. - Мінск : Юнацтва, 1996. – 22 с. (Мая першая кніжка).**




**У кнігу ўвайшлі вершы для дзяцей «Зімой у лесе», «Вясной», «Сыны», «Юрачка», «Сосны», «Зіма» і інш.**

**Купала, Я. Курган : паэма / Я. Купала. - Мінск : Беларусь, 1967. - 12 с.**




**У аснове твора — прыдуманая аўтарам легенда пра гордага непакорлівага гусляра і жорсткага князя.**

**На вяселлі княжацкай дачкі гусляр вырашае сказаць праўду пра князя і яго багацце. Гусляр ведаў нашто ідзе. За непакору і непаслухмянасць князь загадвае закапаць Гусляра жывым разам з гуслямі...**

Купала, Я. Паўлінка : камедыя ў 2-х актах / Я. Купала. - Мінск : Мастацкая літаратура, 2006. - 63 с.




У цэнтры падзей камедыі - разумная, дасціпная, вострая на язык Паўлінка. Яна вольналюбівая, здольная пастаяць за сябе, за сваё каханне, ідзе ў жыццё самастойнай дарогай.

Купала, Я. Тутэйшыя : трагічна-смяшлівыя сцэны ў 4 дзеях / Я. Купала. - Мінск : Мастацкая літаратура, 2006. - 94 с.




Адной з галоўных фігур у творы з'яўляецца Мікіта Зносак (звычайны выхадзец з вёскі), які пры царызме быў калежскім рэгістратарам — ніжэйшым паводле рангу чыноўнікам. У новых умовах жыцця гэты чалавек забывае сваё паходжанне, мову, радзіму і пачынае жыць па прынцыпе: «Можна мець светапогляд адзін, думаць другое, гаварыць трэцяе, а рабіць чацвёртае».



**Якуб Колас**

(Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч)

**1882—1956**

**Любіце, ведайце**
**і шануйце мову**
**свайго народа**
**і ўмейце дасканала**
**валодаць ёю.**
**Роднае слова – гэта**
**першая крыніца,**
**праз якую  мы**
**пазнаём жыцце**
**і акаляючы нас свет.**

**Якуб Колас**

Колас, Я. Рак-вусач : казка, вершы. - Мінск : Юнацтва, 1989. – 48 с. - ( Мая першая кніжка).




Казка змяшчае багаты пазнавальны матэрыял: прачытаў якую дзеці пазнаёмяцца з рознымі відамі рыб нашых беларускіх рэк. Казка выхоўвае павагу да чалавека і працы, рукамі якога здабываецца наш хлеб надзённы.

Колас, Я. Раніца ў нядзельку / Я. Колас. - Мінск : ООО «Лазурак», 1997. - 288 с.




У кнігу ўвайшлі алегарычныя апавяданні «Казкі жыцця», якія пранізаны казачнай загадкавасцю, мудрасцю, роздумам аб чалавеку і яго жыццёвым прызначэнні. А таксама ўрывак з паэмы «Новая зямля» - «Раніца ў нядзельку».

Колас, Я. Другое чытанне для дзяцей беларусаў : апавяданні, вершы, байкі, казкі / Я. Колас. - Мінск : Мастацкая літаратура, 2007. – 182 с.




Кніга ўяўляе сабой хрэстаматыю для вучняў 2 класа. Складаецца з 7 раздзелаў: першыя 4 прысвечаны порам года; 3 апошнім раздзелам аўтар даў наступныя назвы: «Родныя вобразы», «Вершы і байкі», «Казкі». Малюнкі прыроды, апісаныя Коласам у чытанцы эмацыйныя і маляўнічыя.

Колас, Я. Сымон-музыка : паэмы / Якуб Колас ; мастак М. М. Селяшчук. - Мінск : Юнацтва, 1991 . - 209 с.




Паэму называюць скарбніцай беларускай мовы. Галоўны герой паэмы дзіўнаваты пастушок Сымон, на якога нават бацькі лаяцца за чулую душу, больш за надзённую працу цікавіцца музыкай зямлі, ветру, лесу, адчувае ў сабе дар песняра. Пасля смерці дзеда — адзінага, хто разумеў яго і шкадаваў, — Сымон ідзе блукаць па свеце ў пошуках сваёй долі.

**Колас, Я. Усход сонца : вершы / Я. Колас. – Мінск : Юнацтва, 1986. – 39 с. – ( Мая першая кніжка).**




**У кнігу ўвайшлі вершы для дзяцей «Усход сонца», «Ручэй», «Летам», «Адлёт жураўлёў», «Дзед-госць», «Зіма» і інш.**

**Колас, Я. За навуку : вершы / Якуб Колас . - Мінск : Мастацкая літаратура, 1976 . - 18 с. – (Мая першая кніжка).**




**У кнігу ўвайшлі вершы для дзяцей «На рэчцы зімою», «За навуку», «Летам», «Песня аб вясне», «Развітанне», «Піянерская песня».**

Колас, Я. На прасторах жыцця : аповесць. - Мінск : Мастацкая літаратура, 1980. - 92с. - (Бібліятэка юнацтва).




У аповесці Я. Колас вядзе размову з моладдзю аб будаўніцтве новага жыцця, аб сяброўстве і каханні, гаворыць аб тым, чаго нельга рабіць, уступаючы ў самастойнае жыццё.

Колас, Я. Новая зямля : паэма / Я. Колас. - Мінск : Мастацкая літаратура, 2007. - 333 с.




Паэма «Новая зямля» лічыцца энцыклапедыяй жыцця беларускага сялянства. На прыкладзе жыцця сям'і лесніка Міхала паказаны лёс беларускага сялянства, якое імкнулася мець сваю зямлю, быць гаспадаром свайго лёсу.

Колас, Я. Міхасёвы прыгоды : паэма. - Мінск : Мастацкая літаратура, 1980. – 46 с. – (Школьная бібліятэка).




Галоўны герой паэмы Міхаська, хоць і гарадскі хлопчык, але добры рыбак, заўзяты грыбнік, Хлопчык тонка адчувае прыроду, умее разгадваць на лясных сцежках.

Колас, Я. Нёманаў дар : апавяданні, аповесць / Якуб Колас . - Мінск : Мастацкая літаратура, 2003 . - 431 с. – (Беларуская проза 20 стагоддзя).




Зборнік апавяданняў «Неманаў дар» адлюстроўвае глыбока-псіхалагічныя з'явы ў чалавечым жыцці. Асаблівасць гэтых твораў не толькі ў пейзажных замалёўках, але і ў перадачы дзеяння.

ГОСУДАРСТВЕННОЕ УЧРЕЖДЕНИЕ КУЛЬТУРЫ
ЦЕНТРАЛИЗОВАННАЯ БИБЛИОТЕЧНАЯ СЕТЬ
БЫХОВСКОГО РАЙОНА

Раённая дзіцячая бібліятэка



**Юныя чытачы!**
**Калі вым цікава прачытаць творы класікаў беларускай літаратуры Янкі Купалы і Якуба Коласа, звяртайцеся, калі ласка, у бібліятэкі ЦБС Быхаўскага раёна.**

**Віртуальную выставу падрыхтавала да 135-годдзя з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа бібліятэкар раённай дзіцячай бібліятэкі: Якаўлева Кацярына.**